**УДК 260.1(476) “11/18”**

# ТВОРЧАЯ СПАДЧЫНА ДОЙЛІДА ІААНА

***Г.М. ЛАБОХА***
***(Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск)***

*Даследуецца гістарычнае развіццё помнікаў культавага дойлідства, якія належаць аўтарству дойліда Іаана. Нададзена ўвага асобе дойліда, сучасніка прападобнай Еўфрасінні Полацкай, “прыстаўніка над майстрамі царкоўнымі”. Разгледжаны аўтарскія гіпотэзы наконт паходжання таленавітага майстра і колькасці створаных храмавых помнікаў. Гэта, як мінімум, Барысаглебскі храм, царква св. Параскевіі Пятніцы Бельчыцкай абіцелі і шэдэўр старажытнабеларускага дойлідства – Спаса-Праабражэнская царква полацкага манастыра св. Спаса. Напрыканцы XII стагоддзя напрацоўкамі дойліда актыўна карысталіся майстры пры ўзвядзенні помнікаў царкоўнага дойлідства ў Смаленску, Ноўгарадзе, Пскове, Уладзіміра-Суздальскіх землях. Праведзены дэталёвы параўнаўчы аналіз архітэктурна-мастацкага вырашэння храмаў, раскрыты вызначальныя рысы ўзвядзення і аздаблення помнікаў, дадзены кароткі нарыс іх сучаснага становішча.*

**Уводзіны.** Гісторыя Спаса-Еўфрасіннеўскага і Барысаглебскага манастырскіх комплексаў цесна звязана з імем славутага дойліда Іаана. Барысаглебскі храм, царква св. Параскевіі Пятніцы Бельчыцкай абіцелі і шэдэўр старажытнабеларускага дойлідства – Спаса-Праабражэнская царква манастыра св. Спаса – як мінімум тры выдатныя гісторыі ў камені, якія належаць яго аўтарству [6, с. 45]. Пазначаныя помнікі абодвух манастырскіх ансамбляў г. Полацка аб’ядноўвае падабенства будаўнічых матэрыялаў і тэхнікі архітэктурна-мастацкага вырашэння: арыгінальная плінфавая муроўка са “схаваным” радам, больш вузкія бакавыя нефы і значная выцягнутасць у плане.

Роля і непасрэдна асоба архітэктара ў XII стагоддзі даволі цьмяна раскрыта ў тагачасных пісьмовых крыніцах, прысвечаных гісторыі старажытнарускага дойлідства. На першым плане заставаліся данатары сакральнай пабудовы і непасрэдна царкоўныя іерархі, якія асвячалі храмавы помнік. Заўважым, што паіменна вядома толькі чатыры выбітных дойліды, якія працавалі ў межах XII стагоддзя: будаўнікі сабора Наўгародскага Юр’ева манастыра Пётр (1119), Кірылаўскай царквы ў Ноўгарадзе Кораў Якаўлевіч (1196), сцяны каля Выдубіцкага манастыра Пётр-Міланег (1199) і непасрэдна “приставник над делатели церковными” – дойлід Спаса-Праабражэнскага храма Іаан. Калі першых тры архітэктары ўзгаданы ў летапісных крыніцах, то звесткі аб асобе Іаана (Івана – па некаторых крыніцах) змяшчае выдатны помнік агіяграфіі “Жыціе Еўфрасінні Полацкай”. У тэксце “Жыція...” узгадваецца “прыстаўнік над майстрамі царкоўнымі” Іаан [30, с. 361]. У зваротах да дойліда прападобная Еўфрасіння называла яго “отче”, што дае падставы некаторым вучоным (Г.В. Штыхаў і інш.) лічыць таленавітага архітэктара манахам аднаго з полацкіх манастыроў, хутчэй за ўсё Бельчыцкага [3, с. 12]. На думку даследчыка, узвядзенне царквы Спаса Праабражэння вялося па замове полацкай княжны, а сама арцель відавочна была манастырскай, бо ўзначальваў яе манах Іаан [15, с. 25]. У сваю чаргу беларускі даследчык “Жыція...” А.А. Мельнікаў мяркуе, што таленавітаму майстру, які пакінуў у Полацку не меней як за тры храмы, неабавязкова быць манахам [10, с. 35].

Паходжанне дойліда застаецца таксама нявысветленым. Магчыма, адукаваны майстар прыехаў у Полацк з Кіева-Пячорскага манастыра разам з полацкім епіскапам Мінай (1105 – 1116) [12, с. 25]. На думку Л.В. Аляксеева, творчы шлях Іаана распачаўся з засваення ідэйных напрацовак кіеўскіх майстроў, якія, як высветліў П.А. Рапапорт, былі запрошаны Усяславічамі ў Полацк з мэтай пабудовы храма-ўсыпальні св. Георгія ў Сяльцы. Ужо пасля ад’езду кіеўскіх будаўнікоў дойлід здолеў стварыць епіскапскую арцель.

**Асноўная частка.** Размешчаны на левым беразе Заходняй Дзвіны, пры ўпадзенні ў яе ракі Бяльчанка, манастыр св. Барыса і Глеба адначасова служыў летняй рэзідэнцыяй полацкага князя і абарончым фарпостам пры падыходзе да Полацка з поўдня. Менавіта там, у Бельчыцах, Іаан удала выкарыстаў свой творчы патэнцыял. Барысаглебскі і Пятніцкі храмы Бельчыцкага манастыра характарызаваліся кампазіцыйнай разнастайнасцю і адметнай спецыфікай архітэктурнага вырашэння. Гэта, безумоўна, сведчыць аб шырокім дыяпазоне будаўнічага майстэрства дойліда [4, с. 75].

Правядзем параўнаўчы аналіз архітэктурна-мастацкага вырашэння царкоўных збудаванняў мяркуемага аўтарства Іаана. Што датычыцца першага твора Іаана, а менавіта Барысаглебскай царквы, то ён яшчэ ў 1929 годзе ўзвышаўся да аснавання скляпенняў. Трохнефавы крыжова-купальны будынак з трыма апсідамі, шасцю крыжовымі ў сячэнні лапаткамі на сценах і хорамі над бабінцам па сваіх прапорцыях быў блізкі да памераў Спаса-Праабражэнскага храма. Агульныя рысы падабенства абедзвюх храмавых пабудоў (Спаса-Праабражэнскай і Барысаглебскай цэркваў) дазволілі шэрагу сучасных вучоных (А.А. Трусаў, А.І. Лакотка і інш.) выказаць думку аб ранейшай пабудове Барысаглебскага храма. Архітэктурныя асаблівасці будынка, старажытная сістэма кладкі сцен (“са схаваным радам”) і падмурка дазваляюць аднесці час узвядзення Барысаглебскага храма да 10 – 20-х гадоў XII стагоддзя [16, с. 33].

Дзеля ўзмацнення дэкаратыўнага эфекту палосы плінфы былі дадаткова падфарбаваны чырвона-карычневым колерам, што забяспечвала так званую "паласатасць" муроўкі [13, с. 507]. Нагадаем, што аналагічная з'ява была характэрнай рысай мастацкага вырашэння Пятніцкай царквы Бельчыцкага манастырскага комплексу. Фасад царквы св. Барыса і Глеба быў аздоблены двума ярусамі аконных праёмаў з драўлянымі аканіцамі для круглага і трохвугольнага шкла. Падлога была выкладзена керамічнымі пліткамі. Інтэр'ер царкоўнай пабудовы быў багата аздоблены фрэскавым роспісам, па стылю і тэхніцы выканання блізкім да кіева-візантыйскіх традыцый.

На паўночна-ўсходнім напрамку ад Барысаглебскага храма ў першай трэці XII стагоддзя быў пастаўлены невялікі мураваны бясстоўпны храм са склепам, магчыма, пахавальня князя Барыса Усяславіча, так званая Пятніцкая царква. Бесслуповая, з прамавугольнай апсідай, яна нагадвала сабой раннехрысціянскія базілікі [23, с. 74]. Мяркуючы па размяшчэнню фрэскавага роспісу, Пятніцкая царква не мела бакавых уваходаў, адзіны (цэнтральны) уваход, размяшчаўся ў заходняй сцяне [15, с. 468]. Кампактны, прамавугольны ў плане аднаапсідны храм выконваў функцыі тагачаснай княжацкай спачывальні, дзе, па ўсёй відавочнасці, змяшчаліся пахаванні фундатара манастыра Барыса Усяславіча і яго пазнейшых нашчадкаў.

Руіны Пятніцкай царквы даследаваліся І.М. Хозеравым у 1926 і 1928 гадах. Вучоны выявіў першапачатковыя фрагменты XII стагоддзя і пазнейшыя прыбудовы, якія адносяцца да 1770 – 1790 гадоў. На час даследавання ад XII стагоддзя ацалелі значныя фрагменты паўднёвай, паўночнай і ўсходняй сцен царквы, якія вызначаюць аўтэнтычныя памеры храма – 5,1 × 5,75 м [10, с. 56].

Першапачатковы аб'ём храма складаўся з трох частак: высокі чацвярык, да якога з усходу прымыкала ніжэйшая прамавугольная апсіда, а з захаду – вузкі прытвор. Сцены царквы былі змураваны з высакаякаснай плінфы з клеймамі ў тэхніцы "са схаваным радам" на рошчыне з дамешкам цамянкі. Дэкаратыўнасць муроўкі была падкрэслена падфарбоўкай палос плінфы чырвона-карычневым колерам. Падчас раскопак былі знойдзены пліткі падлогі з палівай [9, с. 59].

Наяўнасць крыпты ў падмурку храма стала крыніцай падання аб існаванні пад паўночнай сцяной царквы Параскевіі патаемнага ўвахода ў падземны тунэль, які нібыта з даўнейшых часоў быў праведзены пад Дзвіной ад Пятніцкага храма да Верхняга замка і царквы Спаса Праабражэння. Менавіта такім шляхам, на думку палачан XIX стагоддзя, тры асноўныя аб'екты Полацка злучаліся паміж сабой.

На ўсходніх прасценках царквы, па баках праёма ў алтарную апсіду былі адлюстраваны выявы князёў Барыса і Глеба. На падставе фрэскавай выявы святых воінаў Барыса і Глеба на прадалтарнай сцяне І.М. Хозераў лічыў, што менавіта гэта царква першапачаткова называлася Барысаглебскай. Даследчык таксама першым выказаў меркаванне наконт прыналежнасці гэтай пабудовы аўтарству дойліда Іаана [14, с. 16].

На думку даследчыкаў (П.А. Рапапорт, Г.В. Штыхаў, Э.М. Загарульскі і інш.), апошні твор полацкага дойліда з'яўляўся своеасаблівай рэпетыцыяй яго шэдэўра – царквы Спаса Праабражэння [1, с. 63]. Іаан першы са старажытных майстроў парывае з канонамі візантыйска-кіеўскай архітэктуры і стварае свой адметны тып храма вежападобнай кампазіцыі.

Працы па будаўніцтву Спаскай царквы былі арганізаваны ім з вялікай дакладнасцю. Дойлід разумна выкарыстаў пэўную колькасць людскіх і матэрыяльных рэсурсаў, дзякуючы чаму царква св. Спаса была пабудавана ў азначаны тэрмін – да свята Праабражэння. Год пабудовы Спаскага храма дакладна невядомы. Адно можна сказаць з упэўненасцю – царква была ўзведзена не пазней за 1159 год (паводле А.А. Сяліцкага, час заснавання Багародзіцкай царквы, пабудаванай пасля Спаскай) [13, с. 28].

У старажытнарускім дойлідстве XI – XII стагоддзяў сфарміраваўся і атрымаў пашырэнне трохнефавы і трохапсідны крыжова-купальны храм, у якім нефы звычайна нязначна адрозніваліся па шырыні, а адпаведныя ім апсіды амаль не адрозніваліся паміж сабой па памерах і форме. Пры канструкцыйным вырашэнні царквы св. Спаса Іаан адыходзіць ад пазначанай схемы. Бакавыя нефы храма былі значна вузейшымі за цэнтральны, а апсіды, што завяршаюць іх, невялікія і пэўным чынам "схаваны" ў тоўшчы ўсходняй сцяны. Цэнтральны неф Спаскай царквы завершаны моцна высунутай апсідай паўкруглай формы [25, с. 119]. Унутры храм мае шасціслуповую форму болей нідзе не паўторнай кампаноўкі [24, с. 166]. Крок і пралёт паміж слупамі і сценамі аднолькавы і меншы за іх таўшчыню [3, с. 176]. Пры азначаным характары члянення ўнутранай прасторы ўтвараюцца вельмі маленькія, квадратныя ў плане вуглавыя кампартыменты. Гэта стварае рэальнае адчуванне перавагі масы матэрыялу над унутранай прасторай храма, якая падзелена шасцю масіўнымі слупамі на тры нефы [3, с. 176]. Пераход ад васьміграннай формы слупоў да квадратнай у нартэксе ажыццяўляецца на ўзроўні хораў, а ў падкупальных слупах значна вышэй, што дазваляе больш эфектна раскрыць падкупальную прастору, якая раптоўна імкліва ўзносіцца ўверх да светлавога барабана купала на невялікіх ветразях [3, с. 177]. Крок нартэкса роўны боку падкупальнага квадрата. Над ім зроблены параўнальна невялікія хоры, якія адкрываюцца ў прастору кафалікона шырокім арачным праёмам. Лесвіца на хоры вядзе праз тоўшчу заходняй сцяны. Такі тып лесвіцы з'яўляецца характэрнай рысай віцебскай царквы Дабравешчання [10, с. 7].

На ўзроўні хораў Спаскай царквы знаходзяцца дзве маленькія крыжападобныя ў плане капэлы, ва ўсходніх сценах якіх зроблены невялікія алтарныя нішы і акенцы. Тут былі ўладкаваны келлі прападобнай Еўфрасінні (справа ад увахода) і яе стрыечнай сястры Еўпраксіі [3, с. 178]. Неабходна адзначыць тэхніку кладкі будынка з так званым "схаваным" радам на вапнавай рошчыне з дамешкам дробнатаў-

чонай цэглы (адметная рыса полацкага манументальнага дойлідства). Падлога Спаскай царквы была выкладзена паліванымі керамічнымі пліткамі [7, с. 98].

Вялікую гісторыка-культурную каштоўнасць прадстаўляе фрэскавы роспіс інтэр'ера Спаса-Праабражэнскай царквы, які захаваўся да нашых дзён у значнай колькасці фрагментаў [13, с. 249]. У роспісе царквы прымалі ўдзел некалькі выдатных майстроў са сваёй непаўторнай творчай манерай, блізкай да візантыйскіх канонаў. У культурна-стылістычным плане фрэскавы жывапіс царквы мае пэўнае падабенства з манументальным жывапісам Ноўгарада.

Унутры на тынкоўцы сцен царквы св. Спаса размешчаны шматлікія графіці. Зробленыя кірылічным пісьмом XII – XV стагоддзяў і лацінiцай XVI – XIX стагоддзяў надпісы з'яўляюцца маўклівымі сведкамі складанай канфесійнай сітуацыі ў Полацку азначанага перыяду [5, с. 65].

Тэндэнцыю да пірамідальна-яруснай кампазіцыі дойлід Іаан віртуозна развіў на прыкладзе невялікага камернага аднагаловага храма, надаўшы яму ўнікальны мастацкі вобраз [25, с. 230]. Азначаны помнік – вынік працяглай эвалюцыі старажытнарускага дойлідства – заслугоўвае пільнай увагі з прычыны глыбокага сімвалізму сваёй архітэктуры. Надзвычайная масіўнасць апорных канструкцый Спаскай царквы тлумачыцца задумай майстра стварыць глыбока сімвалічны і светлы мастацкі вобраз храма як сімвала духоўнага гарэння [3, с. 180]. Змрочны інтэр'ер храма кантраставаў з яго багата аздобленым вонкавым выглядам, накіраваным да свету. Дадзеная акалічнасць абуджала думкі вернікаў аб марнасці жыцця зямнога і, адпаведна, святасці духоўнага [7, с. 74]. Існуюць такія меркаванні, быццам полацкі дойліднаватар таксама ўзначальваў арцель па будаўніцтву царквы Багародзіцы ("новай") у заснаваным Еўфрасінняй мужчынскім манастыры.

Канструкцыя Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы непасрэдна звязана з віцебскай царквой Дабравешчання. Але, паўтараючы ў агульных рысах той самы тып, Спаская царква мае зусім іншыя прапорцыі ў сувязі з асобнай сістэмай накрыцця даху. Прапорцыі царквы св. Спаса ў параўнанні з царквой Дабравешчання больш вытанчаныя, у той час як апошняя занадта прысадзістая і выцягнутая ў даўжыню, Спаская царква ўздымаецца ў вышыню [22, с. 116, 118]. Варта адзначыць, што ў дэкоруме і вынаходніцтвах некаторых канструкцыйных частак царква св. Барыса і Глеба значна адрозніваласяя ад Спаскай. Параўнальна з ёй яна мела меншыя памеры, больш простыя абрамленні вокнаў, традыцыйную крыжападобную форму слупоў і аднаабломныя лапаткі. Хоць прапорцыі планаў абедзвюх цэркваў складаюць адносіны 2 : 3, план Барысаглебскай царквы не мае падкрэсленай выцягнутасці і некалькі масіўны ў параўнанні са стромкім сілуэтам Спаса-Праабражэнскай царквы [5, с. 38].

Падзел бакавых сцен храма лапаткамі сведчыў аб моцна вылучанай цэнтральнай вежы, што не назіралася ў Спаса-Праабражэнскім храме. Паміж тым у Барысаглебскай царкве адсутнічала ўбудаваная лесвіца на хоры, а корабавае скляпенне нартэкса, відавочна, паўтарала больш ранняе корабавае скляпенне Пятніцкай царквы. Акрамя таго, у ёй больш выразна выяўлены элементы ўплыву раннехрысціянскага дойлідства Закаўказзя. На іх падставе можна ўпэўнена сцвярджаць, што будаўнікі Барысаглебскай царквы Бельчыцкага манастыра мелі духоўна-практычныя стасункі з праваслаўнымі манастырамі закаўказскага рэгіёну. Азначаныя помнікі Бельчыцкага манастырскага комплексу аб'ядноўвае падабенства кладкі са "схаваным радам", запаўненне вапнавым растворам (цамянкай) паласы шырынёй 10 – 12 см паміж двума радамі вытарклых цаглін і выцягнутасць архітэктурнай формы, што яскрава сведчыць аб іх прыналежнасці да арцелі дойліда Іаана [7, с. 15].

Нялёгкі лёс напаткаў спадчыну таленавітага майстра. У першай палове XX стагоддзя была страчана царква Параскевы Пятніцы. Да 1925 года ад помніка сакральнага дойлідства захаваліся дзве паралельна размешчаныя каменныя сцяны, прастора паміж якімі была цалкам запоўнена цагляным ломам і смеццем. У разбураным стане таксама знаходзіліся дах, званіцы і ўсе драўляныя часткі будынка. Шматлікія перабудовы, рамонтныя і рэстаўрацыйныя работы другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя прывялі да моцнага змянення першапачатковага выгляду Барысаглебскай царквы. У 1925 годзе царква ўяўляла сабой толькі чатыры моцна пашкоджаныя сцяны. Купал і дах храма былі зняты, знішчаны алтарная апсіда, прытвор і падлога. Напачатку 30-х гадоў XX стагоддзя царква Барыса і Глеба была цалкам зруйнавана [19, с. 467].

Такім чынам, на працягу 20 – 30-х гадоў XX стагоддзя храмы Бельчыцкага манастыра з маўклівага дазволу гарадскіх улад былі разабраны мясцовымі жыхарамі на цэглу дзеля ўласных гаспадарчых патрэб. У 1930-я гады кіраўнікі горада прынялі рашэнне аб канчатковым зруйнаванні сакральных будынкаў архітэктурнага ансамбля. Разам з царкоўнымі мурамі назаўсёды зніклі і непаўторныя ўзоры фрэскавага роспісу. З вышэйпералічаных архітэктурных помнікаў, створаных пад кіраўніцтвам Іаана, да нашага часу мусіў захавацца толькі адзін – Спаса-Праабражэнская царква [7, с. 17]. Як лічыць даследчык Л.В. Аляксееў: "…упрощённый подход себя полностью оправдал: храм нерушимо стоит до сего дня, а из всех трёхпритворных храмов Руси… через 200 – 300 лет выносили уже мусор обрушившихся сводов. Среди низких деревянных построек монастыря рядом с усыпальницей епископов храм Евфросинии выглядел небольшой изящной свечой…" [1, с. 16].

Разглядаючы храм выключна з канструкцыйных пазіцый, можна ўпэўнена сцвярджаць, што задума дойліда цалкам спраўдзілася – архітэктурная кампазіцыя Спаскай царквы захавалася да нашых дзён у амаль некранутым стане. Па-мастацку ўладкаваная ў ландшафт, яна і сёння складае гарманічнае пачуццё завершанасці і суладнасці.

**Заключэнне.** Да сярэдзіны XII стагоддзя полацкае дойлідства прайшло плённы шлях развіцця. У Полацку склалася моцная архітэктурная школа, у чым ёсць безумоўная заслуга дойліда Іаана. Напрыканцы XII стагоддзя напрацоўкамі дойліда актыўна карысталіся майстры пры ўзвядзенні помнікаў царкоўнага дойлідства ў Смаленску, Ноўгарадзе, Пскове, Уладзіміра-Суздальскіх землях. Стаўшы кіраўніком самастойнай полацкай арцелі, ён увасобіў імкненне да вертыкалізму храмавых пабудоў у архітэктурных формах Барысаглебскай, Пятніцкай царквы Бельчыцкага манастыра і асабліва ў храме Спаса Праабражэння Еўфрасіннеўскага манастыра.

ЛІТАРАТУРА


1. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля: Очерки истории Северной Белоруссии / Л.В. Алексеев. – М.: Наука, 1966. – 295 с.
2. Баранава, Ю.А. Страчаная архітэктурная спадчына Полацка: Гістарычны лёс Барысаглебскага манастыра / Ю.А. Баранава // Вестн. Полоц. гос. ун-та. – 2005. – № 1. – С. 20 – 26.
3. Воронин, Н.Н. Бельчицкие руины / Н.Н. Воронин // Архитектурное наследство. – 1956. – № 6. – С. 3 – 20.
4. Ганецкая, І. Асаблівасці полацкага дойлідства XI – XII стст. / І. Ганецкая // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. – Полацк, 1998. – С. 71 – 76.
5. Говорский, К. Историческое описание Полоцкого Борисоглебского монастыря / К. Говорский // Полоцкий летописец. – 1992. – № 1. – С. 37 – 42.
6. Загарульскі, Э.М. Заходняя Русь: IX – XIII стст. / Э.М. Загарульскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 240 с.
7. Лабоха, Г.М. Гісторыя заснавання Бельчыцкага Барысаглебскага і Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыроў у г. Полацку / Г.М. Лабоха // Труды молодых спец. Полоц. гос. ун-та. Вып. 28. – 2008. – С. 12 – 15.
8. Лаврецкий, Г.А. Православное зодчество Беларуси / Г.А. Лаврецкий. – Минск: Четыре четверти, 1995. – 104 с.
9. Лаврецкий, Г.А. Церковь Спаса: архитектурная проповедь / Г.А. Лаврецкий // Архитектура и строительство. – 2007. – № 3. – С. 92 – 97.
10. Лаврецкий, Г.А. Архитектурное наследие Беларуси XII в. / Г.А. Лаврецкий // Градостроительство и архитектура: Актуальные проблемы. – Минск: “Тэхналогія”, 2002. – С. 77 – 82.
11. Лакотка, А.І. Полацкая школа дойлідства / А.І. Лакотка // Архітэктура Беларусі: Нарысы эвалюцыі ва ўсходне-славянскім і еўрапейскім кантэксце: у 4 т. / А.І. Лакотка [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – Т. 1: IX – XIV стагоддзі. – С. 154 – 185.
12. Мельников, А.А. Преподобная Евфросиния Полоцкая / А.А. Мельнікoв. – Минск: Четыре четверти, 1997. – 112 с.
13. Остапчик, Л. Молитва полоцких мастеров / Л. Остапчик // Полоцкие епархиальные ведомости. – 2007. – № 4, 5. – С. 7.
14. Преподобная Евфросиния Полоцкая: Житие и акафист. – Минск: Изд-во Белорус. экзархата, 2000. – 132 с.
15. Раппопорт, П.А. Полоцкое зодчество XII века / П.А. Раппопорт // Советская археология. – 1980. – № 3. – С. 142 – 161.
16. Раппопорт, П.А. Зодчество Древней Руси / П.А. Раппопорт. – Л.: Наука, 1986. – 159 с.
17. Раппопорт, П.А. Строительное производство Древней Руси (X – XIII вв.) / П.А. Раппопорт. – СПб.: Наука, 1994. – 160 с.
18. Слюнькова, И.Н. Монастыри восточной и западной традиций: наследие архитектуры Беларуси / И.Н. Слюнькова. – М.: Прогресс-Традиция, 2002. – 600 с.
19. Чантурия, В.А. История архитектуры Белоруссии / В.А. Чантурия. – Минск: Выш. школа, 1985. – 295 с.
20. Штыхаў, Г.В. Мураванае дойлідства / Г.В. Штыхаў // Археалогія Беларусі: у 4 т.; рэдкал. П.Ф. Лысенка [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – Т. 3: Сярэдневяковы перыяд (IX – XIII стст.). – С. 467 – 478.
21. Штыхаў, Г.В. Сучаснік найпадобнай Еўфрасінні – полацкі дойлід Іаан / Г.В. Штыхаў // Асветніцтва і гуманістычныя каштоўнасці Беларусі ў рэтраспектыве часу. – Мінск: Дэполіс, 2002. – С. 30 – 35.
22. Шчакаціхін, М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / М. Шчакаціхін. – Т. 1. – Менск, 1928. – 278 с.


*Паступіў 28.06.2011*

## THE CREATIVE HERITAGE OF IOHAN, THE ARCHITECT

***G. LABOHA***

*The article is devoted to investigating of historical development of the cult construction monuments by Iohan, an architect. The attention is paid to the personality of the architect, contemporary of St. Evfrosinia of Polotsk. The author's hypotheses concerning the talented master's origin and the created temple monuments quantity are considered. The detailed analysis of the architectural-artistic solution of the temples is given, the key characterristics of the monuments erection and decoration are revealed; a short sketch of their actual state is provided.*